Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Сцяг соцыялізма

Орган Чашніцкага РК КП(б)Б і раённага Совета дэпутатаў працоўных

№ 33 (140) | Панядзелак, 7 мая 1945 года | Цана 15 кап.

## 5 МАЯ—ДЗЕНЬ БОЛЬШЭВІЦКАГА ДРУКУ

Большэвіцкі друк на працягу ўсіх год існавання партыі Леніна—Сталіна заўсёды выконваў роль магутнай зброі прапаганды, агітацыі і арганізацыі. Ён з'яўляўся і з'яўляецца найбольш гібкім і дзейным сродкам сувязі партыі з шырокімі народнымі масамі.

„Друк—адзіная зброя, пры дапамозе якой партыя штодзенна, штогадзінна гаворыць з рабочым класам на сваім патрэбным ёй языку. Другіх сродак працягнуць духоўныя ніці паміж партыяй і класам, другога такога гібкага апарата ў прыродзе не маецца“ (Сталін).

Гісторыя нашага друку—гэта гісторыя гераічнай барацьбы пролетарыята, працоўных за перамогу соцыялізма. Гэта гісторыя пачынаецца з паяўлення першых рабочых лісткоў у дні пачатку дзейнасці, арганізаванага Леніным пецербургскага „Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа“.

Першым абразцом газеты новага тыпа з'явілася „Искра“ сыграўшая ўсясвірна—гістарычную роль у справе фарміравання большэвіцкай партыі. Ленінская „Искра“ з'явілася подлінным калектыўным арганізатарам партыі новага тыпа. Ад „Искры“ к „Правде“, к друку сённяшніх дзён вялікі шлях упартай работы партыі большэвікоў, таварышоў Леніна і Сталіна за заваяванне дыктатуры пролетарыята, за умацаванне совецкага ладу.

Роль друку, як выпрабаванай зброі комуністычнага выхавання і магутнага перадатачнага апарата ад партыі к масам, асабліва ўзрасла зараз, ў час Вялікай Айчыннай вайны. Друк з'явіўся ў руках партыі магутнай зброяй выкрыцця бандыцкіх ідэй нацыскай Германіі, арганізатарам барацьбы супроць нямецкіх захопнікаў. Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, совецкі друк адыграў вялікую ролю ў вызваленні нашай Радзімы ад акупантаў, у разгроме полчышч гітлераўскіх банд.

Большэвіцкі друк змог дабіцца вялікіх поспехаў дзякуючы таму, што яго арганізатарамі былі большэвіцкая партыя, асабіста таварышы Ленін і Сталін, што на працягу ўсіх год Совецкай улады кіруюць друкам партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна.

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### З аперацыйнай зводкі за 5 мая

На працягу 5 мая войскі 3-га Беларускага фронта вялі баі па ачышчэнню ад праціўніка касы Фрыш Нерунг і занялі пры гэтым населеныя пункты Лавхатэн, Одэнаў, Шотланд, Штрэднаў.

Войскі 2-га Беларускага фронта 5 мая авалодалі гор. Свінэмюндэ—моцным апорным пунктам абароны немцаў і ваенна-марской базай на Балтыйскім моры і поўнасцю ачысцілі ад праціўніка астравы Волен, Узедом, заняўшы пры гэтым некалькі буйных населеных пунктаў. У баях за 4 мая войскі фронты ўзялі ў палон больш 11700 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў —55, танкаў—24, палявых гармат—88.

Войскі 1-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне на паўднёвы захад ад горада Брандэнбург занялі гарады Лооург, Бург, Фюзан, Говерн, Ростаў. У баях за 4-га мая войскі фронта ўзялі ў палон 2860 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 4-га Украінскага фронта, наступаючы на паўднёвы захад і поўдзень ад горада Мараўска—Астрава занялі гарады Хопцварцэ, Домштацэль, Шульдэн, Гінцэ і з баямі занялі буйныя населеныя пункты Раук, Штатлібаў, Фрыдланд, Рожчаў. За 4-га мая войскі фронта ўзялі ў палон 1100 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Войскі 2-га Украінскага фронта, прадаўжаючы наступленне на паўночны ўсход ад горада Брно занялі горад Кромержыж—моцны апорны пункт абароны немцаў на рацэ Марава.

На другіх участках фронта—істотных змен не было.

За 4-га мая на франтах падбіта і знішчана 20 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 14 самалётаў праціўніка.

## ПАДПІСКА ЗАМАЦАВАНА

Адказваючы на гістарычныя перамогі Чырвонай Арміі актыўна правялі падпіску на Чацвертую Дзяржаўную Ваенную пазыку работнікі Чашніцкага райспажыўсаюза, дзе падпіску праводзіў таварыш Крутаўцоў. Усе работнікі райспажыўсаюза падпісаліся на 100 процантаў сярэдняга месячнага заработка.

Падпісная сума ў колькасці 11495 рублёў ужо здана ў касу дзяржбанка.

На 50 процантаў сабралі наяўнымі і здалі ў дзяржбанк таксама і работнікі Гарпо, дзе падпісная сума складае 6230 рублёў.

Казлоўскі

## Для ўмацавання фронта

Шырока разгарнулася падпіска на Чацвертую Дзяржаўную Ваенную пазыку сярод калгаснікаў Лазукоўскага сельсовета. Калгаснікі калгаса „Цэнтр Труханавічы“ падпісаліся на 13200 рублёў. Старшыня гэтага калгаса тав. Байкоў Пётр падпісаўся на 700 рублёў. Калгасніца Каваленка Н.—на 600 рублёў. Выступіўшы на агульным сходзе 70-ці гадовы калгаснік Шархун Сямён сказаў:—„Два маіх сыны загінулі ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі і для ўмацавання Чырвонай Арміі я падпісваюся на пазыку ў суме 500 рублёў, каб таварышы маіх сыноў адпомсцілі фашыстам за іх смерць“. Усяго калгасы Лазукоўшчыны падпісаліся на 83190 рублёў. Падпіска працягваецца.